■ Руплівым гаспадарам

# ПЕРШАЯ — У МАІ, АПОШНЯЯ — У ЛІСТАПАДЗЕ

## Новыя тэхналогіі вырошчвання маліны

**«Маліна пайшла!» У хуткім часе, хочацца верыць, такімі навінамі беларусы змогуць дзяліцца ўжо ў апошнія дні мая. Ва ўсякім разе, нашы вучоныя зараз адпрацоўваюць тэхналогіі, якія дазволяць атрымліваць запатрабаваную ягаду не толькі ў канцы вясны, а нават у лістападзе — снежні.**

Усяго з дзясятак гадоў таму цяжка было паверыць, што на Беларусі можна вырошчваць рэмантантную маліну, а сёння яна становіцца прамысловай культурай. У краіне ёсць нават некалькі спецыяльных камбайнаў для ўборкі такой ягады. Адзін з іх набыты і летась выпрабаваны на ягадных плантацыях Інстытута пладаводства. Праўда, маліна, сабраная такім чынам, ідзе на перапрацоўку. Але і «ручны» ўраджай з Самахвалавіч ужо парадаваў наведвальнікаў сталічных магазінаў.

— Гэта цікавая культура мае шэраг перавагі, і галоўнае, працягвае тэрмін ужывання свежых ягад практычна да першых маразоў, — расказвае **загадчык аддзела ягадных культур Інстытута пладаводства Вольга ЕМЯЛЬЯНАВА.** — Расце маліна ў закрытым грунце. Дзве цяпліцы па шэсць сотак кожная, усяго ў іх — 1200 раслін, і за сезон летась мы атрымалі дзве тоны дэсертных ягад першага гатунку. Гэта вельмі добры вынік. Часта з адкрытага грунту падобнага ўраджаю не атрымаць. Апошнім часам назіраюцца раннія асеннія замаразкі. У пачатку ці сярэдзіне верасня тэмпература можа паніжацца да мінус 2—3 градусаў, ягада замярзае на кустах і больш не аднаўляецца. Ва ўмовах закрытага грунту такой праблемы няма.

### Дом для ягаднікаў

Уявіце: пачатак вясны, на «вулічнай» маліне і іншых культурах толькі паўзуць першыя лісточкі, а ў самахвалавіцкіх цяпліцах ужо завязваюцца ягады, сюды спецыяльна пастаўлены скрыні з чмялямі, каб яны дапамаглі з апыленнем.

Ёсць розныя прыёмы, як «прыспешыць» ураджай. Аматары, якія вырошчваюць у сябе рэмантантную маліну, ведаюць, што трэба выдаліць леташнія пабегі, каб атрымаць багаты позні ўраджай, які выспее на атожылках. Але ў адной з цяпліц галінкі, якія перазімавалі, вучоныя не чапалі — дзеля таго, каб на іх як мага хутчэй выспелі першыя, самыя раннія ягады на Беларусі. Гэта тэхналогія «long cane», што ў перакладзе азначае «доўгі парастак». А ўжо калі кусты адпладаносяць, абрэзкі ім не пазбегнуць — усё для таго, каб яны паспелі парадаваць другім, асеннім ураджаем.

А вось у другой цяпліцы вучоныя адпрацоўваюць іншую тэхналогію, тут парасткі былі ўкарочаны. Маліна расце ў гаршках з какосавым субстратам, у кожным па дзве расліны. Праведзены «персанальныя» кропельніцы, праз якія дастаўляецца вада з угнаеннямі. Усё ж гэта культура, каб даць багаты ўраджай, мае патрэбу ў добрым сілкаванні.

Дзякуючы кліматычным умовам, якія стварае чалавек, можна не толькі кантраляваць тэрміны выспявання, але і рабіць перыяд збору ягад працяглым. Пры дадатковай падсветцы і абагрэве ягаду можна атрымліваць і зімой. Дарэчы, летась апошнюю маліну ў Самахвалавічах збіралі 20 лістапада.

— Пакуль мы адпрацоўваем тэхналогіі вырошчвання рэмантантнай маліны на невялікім аб'ёме. Вывучаем галандскія сарты (але ў найбліжэйшы час плануем выпрабоўваць і свае), — расказвае Вольга Уладзіміраўна. — Адпрацоўваем сістэму падкормак. Выкарыстоўваем розныя ўгнаенні, каб падабраць таннейшыя рэчывы.





### Смачна есці!

Сёння ў нашых супермаркетах прадаецца багата заморскай маліны. Напрыклад, можна сустрэць ягаду іспанскую, мексіканскую. Але, калі бачыш, які шыкоўны малінавы ўраджай ужо саспеў пад Мінскам, разумееш, што імпартазамяшчэнне ў гэтым кірунку цалкам магчыма. Прычым кошт беларускай ягады будзе ў 2—3 разы ніжэйшы. Ды і больш карысная яна за заморскую, бо цяжка сказаць пра прадукцыю, вырашчаную ва ўмовах іншага клімату, чым яе апрацоўвалі.

— Мінск у сярэднім за тыдзень спажывае 100 кілаграм дэсертных ягад, гэта толькі супермаркеты. Ляжаць яны ва ўпакоўках на 150—200 грамаў у адзін слой. І мы плануем развіваць кірунак менавіта на падобную вытворчасць, — гаворыць Вольга Уладзіміраўна. — Ужо летась мінчане маглі сустрэць у супермаркетах нашу маліну, прычым тавар, сабраны ўручную ўсяго за 2—3 гадзіны да таго, як паступіў у продаж. Як правіла, гэта ягада хутка разыходзілася. А мы працуем з сартамі, якія маюць добры патэнцыял. Ёсць такі тэрмін як «shelf life» — «жыццё на паліцы». Ён азначае, колькі ягада можа захоўвацца ва ўмовах магазіна, не псавацца і не страчваць смакавых якасцяў. Так, у нашых ягад тэрмін захоўвання ў звычайных халадзільніках — да двух тыдняў! Другі сорт можна прадаваць на рынку па кошце, зніжаным на 20—30 працэнтаў, напрыклад, у кошыках са шпоны, адкрытых латках. Але нават калі не атрымліваецца ягаду прадаць, яе можна замарозіць ці пусціць на перапрацоўку.

***— Ці будзем мы адыходзіць ад звычайнай маліны?***

— Летняя маліна таксама патрэбна, каб прадукцыя паступала на працягу ўсяго сезона. Заканчваецца летняя — пасля прамежак у 2—3 тыдні, калі ягад няма, пакуль не пачнецца рэмантантная. І каб вырашыць гэту праблему, фермеры пачалі завозіць сарты замежнай селекцыі позняга тэрміну выспявання. Дарэчы, нашым інстытутам створаны першы ўласны сорт позняй летняй маліны. Зараз падалі яго на дзяржвыпрабаванне. Фермеры ж прывозяць сарты англійскай селекцыі позняга тэрміну выспявання. Мы іх таксама плануем вывучаць, паколькі клімат Англіі і Беларусі розніца, трэба высветліць, наколькі мэтазгодна вырошчваць гэтыя сарты і ці рэкамендаваць іх буйным гаспадаркам. Акрамя таго, іх можна дадаваць у нашы селекцыйныя работы, скрыжоўваць.

***— На што павінен звярнуць увагу прыватнік, калі набывае маліну?***

— Найперш на каранёвую сістэму і надземную частку. Калі пупышкі адкрыты, каранёвая сістэма валасніковістая, мае добрыя абрастаючыя карані, і на іх, самае каштоўнае — адвентыўныя пупышкі — маленькія белыя парасткі наступнага года. Галоўнае, каб яны былі жывыя, тады прыжываемасць гарантаваная. Калі на расліне 2—3 пупышкі, з адной маточнай расліны атрымаецца 2—3 дадатковыя саджанцы.

***— Штогод у продажы з'яўляецца маліна ў яскравых папяровых скрынях, прычым куст у іх наогул не разгледзець, альбо саджанцы ляжаць з каранямі, завернутымі ў цэлафан. І людзі набываюць такія расліны нават у канцы мая.***

— Вясной садзіць маліну можна ў канцы сакавіка — пачатку красавіка, пакуль у глебе захоўваецца вільгаць і расліна не пачала вегеціраваць, інакш ёй складаней будзе прыжыцца. Пазней — растуць выцягнутыя парасткі, парушаецца фізіялогія раслін. А яшчэ я рэкамендавала б садзіць маліну ўвосень, каб у яе была магчымасць адаптавацца і спакойна ўвайсці ў зімоўку. Дарэчы, у нас ёсць свой магазін. І на восень заўсёды больш прапаноў, разнастайнейшы выбар. Мы робім траншэю, прыкопваем расліны і кожны дзень правяраем, як яны сябе адчуваюць, сочым, каб захоўвалася вільгаць. Калі ж у магазінах расліна прадаецца з каранямі, завернутымі ў цэлафан, там няма адтулін, дрэнажу, яна можа загніваць, з'явіцца плесень, іншыя праблемы, яна можа не прыжыцца наогул ці доўга хварэць.

Важна ўмець выбраць і сарты. Так, часта людзі ганяюцца за замежнымі сартамі, а яны ў нашых умовах сябе не заўсёды добра паказваюць. Напрыклад, такі сорт, як «Зева Хербстэнт», у цэнтральным рэгіёне апраўдвае сябе толькі на 45 працэнтаў, часта ўходзіць пад зіму з зялёнымі ягадамі. У нас жа сортавыпрабавальныя станцыі ёсць у кожнай вобласці і назіранні за культурамі вядуцца не адзін год.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*dziadziula@zviazda.by*

■ Запрашальнік

# ШАБЛІ — ДА БОЮ!

## У фестывалі «Залатая шпора — 1812» прыме ўдзел больш за паўсотні кавалерыстаў

**Як расказалі арганізатары, фінальная гранд-баталія стане не толькі адной з найбуйнейшых у Беларусі, але і адной з самых відовішчных дзякуючы тэатралізаваным элементам, уключаным у шоу.**



Трэці па ліку фестываль-рэканструкцыя «Залатая шпора — 1812» пройдзе 11 чэрвеня на базе аднайменнага конна-гістарычнага клуба ў вёсцы Міжрэчча Валожынскага раёна.

На цэлы дзень гледачы пагрузяцца ў 1812 год, у «эпоху апошняй прыгожай вайны» — з балямі, баталіямі, дуэлямі, народнымі кірмашамі, шляхетнымі пікнікамі і шабельнымі баямі.

Адкрые фестываль гранд-паланэз, у якім па сядзібе пройдуцца прыгожыя паненкі і бравыя афіцэры. Затым пачнецца Адкрыты гасцявы баль. У ім змогуць прыняць удзел і гледачы. Калі нехта ні разу не танцаваў мазурку і пра катыльён мае вельмі расплывістае ўяўленне, танцмайстар навучыць рухам і па.

На шабельных выступленнях будзе прадстаўлена шабельная школа Рэчы Паспалітай, якая з XVII стагоддзя славілася як найлепшая ў Еўропе. Шабля заўсёды лічылася высакароднай зброяй, валоданне ёю было абавязковым для шляхціца. Таксама на фестывалі можна будзе ўбачыць і школу еўрапейскай шпагі.

У кавалерыйскіх спаборніцтвах бравыя ўланы і гусары пакажуць майстэрства коннага бою, прыёмы валодання шабляй і пікай.

Спецыяльна для тых, хто хацеў бы прымераць на сябе мундзір 1812 года, пройдуць «Рэкруцкія гісторыі» ці набор гледачоў у пяхотныя палкі абедзвюх армій. Прыхільнікам этнаграфіі і фальклору будуць цікавыя народныя песні і гульні на Траецкім кірмашы.

Адбудзецца таксама гістарычнае дэфіле, падчас якога госці фэсту больш даведаюцца пра адзенне і моду XIX стагоддзя.



Завершыць фестываль відовішчная гранд-баталія, дзе сыдуцца войскі Вялікай арміі Напалеона і Рускай імператарскай арміі. Увесь дзень на свяце будзе працаваць сапраўдная карчма XIX стагоддзя. Арганізатары абяцаюць смачную ежу са свежых фермерскіх прадуктаў.

Пачатак фестывалю ў 11.00, завяршэнне — а 18-й гадзіне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**10 ЧЭРВЕНЯ**

**1562** год — у Нясвіжы выйшла кніга Сымона Буднага «Катэхізіс». Гэта была першая кніга на старабеларускай мове, якая выйшла на тэрыторыі Беларусі. У ёй аўтар тлумачыў не толькі рэлігійныя догматы, але і выказваў сваё разуменне розных пытанняў сацыяльнага і грамадска-палітычнага жыцця. Захавалася 10 асобнікаў «Катэхізіса» — у Кракаве, Празе, Санкт-Пецярбургу і Маскве.

**1812** год — адкрыта Полацкая езуіцкая акадэмія, першая вышэйшая навучальная ўстанова на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Яна была створана на базе Полацкага езуіцкага калегіума, які дзейнічаў з 1580 года як сярэдняя навучальная ўстанова. Валодала правамі ўніверсітэта, мела ў сваім складзе 3 факультэты: тэалагічны, філасофскі, або вольных навук, старажытных і сучасных моў. Навучанне афіцыйна аб'яўлялася пазаканфесійным, несаслоўным і бясплатным (плата бралася толькі за пражыванне ў інтэрнаце). Колькасць студэнтаў дасягала 700, выкладчыкаў каля 40, у тым ліку вучоныя з Аўстрыі, Германіі, Італіі, Францыі. Сярод выпускнікоў — пісьменнік Ян Баршчэўскі, мастак В. Ваньковіч, філосаф А. Даўгірд і іншыя. Пры акадэміі была найбуйнейшая ў Беларусі бібліятэка, якая на 1812 год налічвала каля 40 тысяч тамоў. Выдаваўся друкаваны орган — часопіс «Полацкі месячнік». Акадэмія была закрыта ў сувязі са скасаваннем ордэна езуітаў у Расійскай імперыі.



**1832** год — нарадзіўся Ота Нікалаус Аўгуст, нямецкі канструктар і прадпрымальнік, адзін з распрацоўшчыкаў атмасфернага рухавіка. У 1884 годзе прапанаваў электрычнае запальванне, што дазволіла выкарыстоўваць у рухавіках вадкае паліва. Памёр у 1891 годзе.

**1907** год — стартаваў першы ў свеце аўтапрабег па маршруце Пекін — Парыж, які быў арганізаваны рэдакцыяй французскай газеты «Матэн».

**1943** год — венгр Ласла Біра запатэнтаваў шарыкавую ручку. Ён працаваў па заказе Брытанскіх каралеўскіх паветраных сіл, якім патрабавалася ручка, здольная пісаць на вялікіх вышынях пры нізкім ціску.

Было сказана

**Ніл ГІЛЕВІЧ, народны паэт Беларусі:**

*«Нам не з жыцця сыходзіць страшна,*
*а з добрай памяці людской».*


УНП 191061436

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «ДАТЧ СТАР»,

опубликованной в газете «Звязда» 17.05.2017 г. №91

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6–11 секции, II очередь строительства, секции 1–3)» (I очередь строительства 5–6 пусковой комплекс):

«Стоимость 1 кв. м нежилого помещения для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, на момент опубликования изменений в проектной декларации по договорам создания объекта долевого строительства составляет: на 1 этаже, площадью 590,44 кв. м, по стоимости, составляющей долларовый эквивалент – 1100 долларов США.

«Стоимость 1 кв. м жилого помещения для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, на момент опубликования изменений в проектной декларации по договорам создания объекта долевого строительства: для **4** однокомнатных квартир, площадью от **40,88** до **48,48** кв. м, составляет от **1050** до **1150** долларов США.

Оплата производится в бел. руб. по курсу доллара НБ на дату оплаты.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. 3-я Щорса, 9, офис 505. Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 50%)

ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГОТТЦ «ГАРАНТ»

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Предмет торгов, краткая характеристика** | **Лот №1** | | |
| | **Капитальное строение с инв. № 443/С-16440** (гараж) общей площадью 121,9 кв. м, одноэтажное кирпичное здание с металлическими воротами, 1990 г. п. | | |
| **Местонахождение имущества** | Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Октябрьская, 34 | | |
| **Информация о земельном участке** | Имущество расположено на земельном участке площадью 0,0150 га с кадастровым номером 425650100001004605, назначение – для обслуживания здания гаража | | |
| **Начальная цена** | **7 980 руб. 00 коп. с учетом НДС** | Сумма задатка (1%) | **79 руб. 80 коп.** |
| **Сведения о продавце** | ОАО «ГОТТЦ «Гарант», г. Гродно, ул. Врублевского, 86/1, тел. 8 (0152) 430354 | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код 739, УНП 500481906 | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | Условия оплаты | по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 30 июня 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов: **по 26 июня 2017 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 04.02.2017 г., от 11.04.2017 г. | | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11 | | | |


## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.40 | 17.02 |
| Віцебск — | 4.20 | 21.38 | 17.18 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.30 | 17.02 |
| Гомель — | 4.34 | 21.17 | 16.43 |
| Гродна — | 4.55 | 21.54 | 16.59 |
| Брэст — | 5.05 | 21.45 | 16.40 |

### Месяц

***Поўня ў 16.09***
***Месяц у сузор'і Казерога.***

### Імяніны

***Пр.** Васіля, Ігната, Іраклія, Мікіты.*
***К.** Дзіяны, Малгажаты, Маргарыты, Ануфрыя, Багуміла, Генрыха, Эдгара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Па правілах добрага тону ў жанчыны не пытаюцца, колькі ёй гадоў, а ў мужчыны — як ён ад войска «адмазаўся».**

— Вова, кажуць, твая Ганна небяспечна хворая.

— Так, хворая. Але небяспечная яна толькі тады, калі здаровая.

**А школьнікі зараз думаюць, што самае страшнае ў мінулым...**

Мы з катом вывучылі новую каманду: калі я здымаю тапак — ён скача на падаконнік і затыкаецца.




Малюнак Пятра КОЗІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынга — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2184.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 чэрвеня 2017 года.